# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

*З. В. Антановіч*
Белорусский государственный университет, Минск

*Z. V. Antanovich*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 929:930:25(476)**

## СТАНАЎЛЕННЕ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ СТРУКТУРЫ ЕПАРХІЯЛЬНЫХ КАНСІСТОРЫЙ ХРЫСЦІЯНСКІХ КАНФЕСІЙ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XIX СТ.

## FORMATION OF THE ORGANIZATIONAL STRUCTURE OF DIOCESAN' CONSISTORIES OF CHRISTIAN CONFESSIONS IN BELARUS AT THE END OF THE 18TH – BEGINNING OF THE 19TH CENTURY

*Аўтарам разглядаюцца падыходы хрысціянскіх цэркваў да структуравання органаў кіравання і духоўнага суда епархіяльнага ўзроўню (кансісторый) на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XIX ст. Захаваныя крыніцы сведчаць, што структура кансісторый і іх штатны склад у агульных рысах вызначаліся дзяржаўнымі патрабаваннямі, а спецыфіка была абумоўлена фактарамі аб'ектыўнага (асаблівасці кіравання цэрквамі, мовы справаводства і інш.) і суб'ектыўнага (асабістым стаўленнем кіраўнікоў епархій) характару. Кансісторыі складаліся з прысутнасці, якая выпрацоўвала праекты рашэнняў для прадстаўлення на разгляд епіскапа і канцылярыі. Пры гэтым у канцылярыях абавязкі служачых размяркоўваліся у адпаведнасці з іх функцыямі, а таксама з выкарыстаннем геаграфічнага крытэрыю.*

*Ключавыя словы: праваслаўная царква; уніяцкая царква; рымска-каталіцкая царква; кансісторыя; прысутнасць; канцылярыя.*

*The author examines the approaches of Christian churches to the structuring of bodies and spiritual courts at the diocesan level (consistory) in the Belarusian lands in the late 18th and early 19th centuries. Preserved sources testify that the structure of the consistories and their staff were generally determined by state requirements, while the specifics were determined by factors of an objective (peculiarities of church management, language of administration, etc.) and subjective (personal attitude of the heads of dioceses) nature. The consistories consisted of the presence, which drafted decisions to be submitted to the bishop, and the chancellery. At the same time, in chancelleries, the duties of employees were distributed according to their functions, as well as using a geographical criterion.*

*Key words: orthodox church; Greek-catholic Church; Roman Catholic Church; consistory; collegium; chancellory.*

Падчас падзелаў Рэчы Паспалітай змяняецца адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне канфесій на беларускіх землях і ўтвараюцца органы

кіраўніцтва і духоўнага суда імі, якімі сталі кансісторыі. Іх фарміраванне для праваслаўнай царквы ў Расійскай імперыі пачалося з маскоўскай духоўнай дыкастэрыі і ўдасканальвалася на працягу XVIII ст. [1, с. 126–137], у тым ліку з развіццём нарматыўнага рэгулявання дзейнасці калегіяльных органаў дзяржаўнага кіравання. У прыватнасці, Генеральным рэгламентам замацоўвалася дзяленне органаў на прысутнасць, паміж членамі якой размяркоўваліся абавязкі непасрэдна па сферы паўнамоцтваў і каардынацыі працы канцылярыі [2, гл. 8]. Склад і паўнамоцтвы службовых асоб апошняй (сакратар, натарыус, перакладчык, актуарыус, рэгістратар, канцылярысты, капіісты) таксама адлюстраваны ў згаданым дакуменце [2, гл. 9, 28–35]. Акрамя таго, прадугледжвалася наяўнасць асобнай канцылярыі кіраўніка адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі [2, гл. 17]. У пачатку XIX ст. канцылярыі падзяліліся на структурныя падраздзяленні – сталы і змяніліся асобныя пасады [3, гл. 3]. Гэта адлюстравалася на структуры канфесіянальнага кіраўніцтва. Аднак, калі гэтыя рэарганізацыі, асабліва Рускай праваслаўнай царквы, выступалі аб’ектам навуковага асэнсавання на працягу стагоддзяў, то станаўленне епархіяльнага кіраўніцтва на беларускіх землях разглядалася ў межах асобных канфесій і кантэкстуальна закранала перыяд канца XVIII – пачатку XIX ст. [1; 4–7]. У прыватнасці, шмат увагі станаўленню органаў кіраўніцтва праваслаўнай царквой у Расійскай імперыі канфесіянальнага і епархіяльнага ўзроўняў надаў Ц. В. Барсаў, аднак у яго працы не адлюстравана як спецыфіка дзейнасці апошніх на беларускіх землях, так і ў параўнанні з інаслаўнымі канфесіямі [1]. Гэты напрамак даследаванняў падтрымала таксама расійская даследчыца В. В. Алеўская, якая прысвяціла артыкул фарміраванню структуры Маскоўскага епархіяльнага кіраўніцтва, якое стала адным з прататыпаў для арганізацыі епархіяльнага кіраўніцтва на беларускіх землях [7]. Беларускія органы епархіяльнага кіраўніцтва заканамерна выступалі аб’ектамі даследавання айчынных навукоўцаў. Так, першы недахоп азначанай вышэй працы Ц. В. Барсава ў дачыненні Магілёўскай праваслаўнай кансісторыі быў выпраўлены П. С. Гаручка падчас даследавання органаў кіравання адпаведнай епархіяй [5, с. 36–40]. Інаслаўным канфесіям таксама прысвячаліся асобныя працы. Так, кадравы склад Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый прааналізаваны ў працы, прысвечанай іх архівам. Пры гэтым, улічваючы даследчыцкаю мэту, аўтарам не ставілася задача іх супастаўлення [4, с. 30–31]. Сярод навукоўцаў, у сферу інтарэсаў якіх уваходзіла ўніяцкая царква, асобныя біяграфічныя звесткі складу кансісторый маюцца ў Д. В. Лісейчыкава і В. Лужынскага [6, с. 24–30, 34; 26, с. 134, 167, 174, 238, 279, 290, 356–357, 514].

На Магілёўскую праваслаўную епархію кіраўніцтва па расійскіх узорах было распаўсюджана ў 1774 г. [5, с. 36], аднак шырока вядомы толькі склад прысутнасці кансісторыі за 1798 г. У яго ўвайшлі ігумен Буйніцкага манастыра Сасіпатра, пратаіерэй кафедральнага сабору Міхаіл Багуслаўскі, настаяцелі Магілёўскай Уваскрасенскай царквы Андрэй Прыгароўскі і Ма-

гілёўскай Мікалаеўскай царквы Пётр Акаловіч, ігумен Аршанскага Багаяўленскага манастыра і рэктар семінарыі Іасафат, ігумен Віцебскага Маркава манстыра Іосіф [5, с. 36–37; 8, арт. 13921]. Да 1803 г. колькасць членаў кансісторыі ўзрасла да дзевяці, аднак на пасяджэннях адначасова яны прысутнічалі рэдка [5, с. 36–40].

Першая праваслаўная кансісторыя на Міншчыне была ўтворана ў 1785 г., калі слуцкаму архімандрыту Віктару (Садкоўскаму), які стаў кіеўскім вікарным епіскапам і пераяслаўскім і барыспальскім епіскапам, былі аддадзены ў падпарадкаванне цэрквы на тэрыторыі Польшчы [8, арт. 16173]. Пры гэтым епіскап Віктар быў незалежным ад кіеўскага мітрапаліта, але па пасадзе іменаваўся каад'ютарам гэтай мітраполіі [9, арк. 1–1 адв., 3–6]. Пры епіскапе ў Слуцку была ўтворана кансісторыя, прысутнасць якой павінна была ўключаць прадстаўнікоў манаскага і прыходскага духавенства [8, арт. 13163]. Сінодам акрэсліваліся крытэрыі для фарміравання штатаў канцылярыі з манахаў Слуцкага Траецкага манастыра, якія б ведалі польскую мову і былі здольнымі да далейшага самаўдасканалення. У выпадку немагчымасці падбору падобных асоб епіскап мог прыцягнуць святароў і царкоўных служачых, але захоўваліся патрабаванні па веравызнаўчай прыналежнасці і моўнай падрыхтоўцы. Кандыдатуры на пасады сакратара і рэгістратара прадстаўляліся ў Сінод [10, арк. 1–1 адв.]. Выключнасць пасады сакратара і значэнне яго адукаванасці падкрэслівалася выкананнем функцый па наглядзе за выкананнем дзеючага заканадаўства, што падкрэслівалася на розных узроўнях кіравання царквой [11, арк. 2–5 адв.].

Арганізацыя працы згаданай кансісторыі працягвалася да 1789 г., калі епіскап быў арыштаваны ў Польшчы, аднак тое, што пасля вяртання ў 1792 г. В. Садкоўскі выклікаў да сябе архімандрытаў Кіпрыяна і Пратасія, а таксама прысутных кансісторыі Германа і Іаана Белазора, канцылярыстаў Мікалая Беляноўскага, Іаана Скулкоўскага, Іаана Кагадоўскага, а таксама падканцылярыста Паўла Баршчэўскага, разам з захаванымі звесткамі сведчыць пра яе аўтаномную дзейнасць у гэты перыяд [12, арк. 1–1 адв., 4; 13, арк. 1].

Мінская епархія на чале з мінскім, ізяслаўскім і брацлаўскім архіепіскапам, якім таксама стаў Віктар (Садкоўскі), была створана ў 1793 г. [9, арк. 1–1 адв., 3–6; 8, т. 23, арт. 17113]. У 1795 г. яе канцылярыя складалася з сакратара Панцелемона Корбута і ўтвараліся пасады пратакаліста і двух павытчыкаў, паміж якімі размяркоўваліся абавязкі, а таксама архіварыуса. Пратакалістам стаў Сямён Саўчанкаў, які займаўся разам з памочнікам Гаўрылам Маркоўскім дакументаваннем паседжанняў прысутнасці кансісторыі, улікам дакументаў, падрыхтоўкай ведамасцей і экстрактаў (вытрымак) у Сінод, а таксама дзейнасцю рэвізійнай экспедыцыі. Сферы паўнамоцтваў павыццяў (структурных падраздзяленняў) былі размеркаваны па геаграфічнай прыкмеце. Павытчыкам Слуцкай, Нясвіжскай, Мінскай, Барысаўскай, Ігуменскай і Вілейскай акруг, а таксама экспедыцыяй па справах

аб далучаных да праваслаўя асобах быў Антон Дашкевіч, якому асіставалі пісары Фама Сасіноўскі і Мікалай Жмуровіч. Павытчыкам Бабруйскай, Мазырскай, Пінскай, Давыдгарадзецкай, Пастаўскай, Дзісненскай і Докшыцкай акруг з'яўляўся Захарый Сахарэвіч, які разам з падканцылярыстам Фёдарам Бабарэкам і пісарам Паўлам Андрыеўскім таксама рыхтаваў да разгляду справы па замежных манастырах епархіі. Аднак пасада архіварыуса заставалася вакантнай [14, арк. 4–6; 15, арк. 2–3].

З 1799 г. структура мінскай кансісторыі ўскладнілася і да геаграфічнай прыкметы размеркавання спраў паміж павыццямі, якіх па-ранейшаму засталося два, была дададзена функцыянальная, па якой утвараліся прыказны і пратакольны сталы. У прыказным стале пад кіраўніцтвам С. Саўчанкава і яго памочніка Андрэя Логвінава працавалі два капіісты. Яны адказвалі за выкананне ўказаў Сінода, справаздачнасці перад ім і распараджэнняў епіскапа, справы семінарыі, фінансаванне яе, архірэйскага дома і кафедральнага сабору, штатных і пазаштатных манастыроў, у тым ліку пытанні атрымання манаскіх абетаў. У ім збіраліся фармулярныя ведамасці цэркваў, метрычныя кнігі і споведныя ведамасці праваслаўных і ўніяцкіх цэркваў, справы аб пераходах у праваслаўе. Пры гэтым архіў таксама аддаваўся пад апеку канцылярыста прыказнога стала А. Логвінава. Аднак, з-за напружанасці працы прыказнога стала архіў быў перададзены кіраўніку трэцяга павыцця Г. Маркоўскаму ўжо ў сакавіку. Пратакольным сталом загадваў Мацвей Мілашэвіч, які з капіістам Аляксандрам Бараноўскім захоўвалі казённыя пячаткі, вялі рэестры спраў кансісторыі і складалі ведамасці па вырашаных і невырашаных з іх для прадстаўлення обер-пракурору Сінода, выдачы пашпартоў і ўказаў, перапіскі з Сінодам, агульную кнігу ўліку паштовых адпраўленняў. Адбылося таксама пераразмеркаванне спраў паміж павыццямі. Прыватныя справы па Слуцкім, Ігуменскім, Барысаўскім, Бабруйскім і Вілейскім паветах вяліся ў павыцці пад кіраўніцтвам Гаўрылы Маркоўскага і капііста Якава Кранікоўскага, а справы па Мінскім, Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах – у павыцці Пятра Яфімовіча і капііста Восіпа Каржанеўскага [14, арк. 4–6].

Структура Беларускай рымска-каталіцкай і ўніяцкіх кансісторый у 1772 г. на агульнадзяржаўным узроўні акрэслівалася да складу прысутнасці з 2–3 прадстаўнікоў духавенства [8, т. 19, арт. 13922]. Аднак, калі на ўтрыманне рымска-каталіцкага біскупа, яго дома і кансісторыі выдзялялася 10000 руб., то ўніяцкі пакідаўся на былым утрыманні [8, т. 19, арт. 13922, 14073]. Нягледзячы на такую суму, рэзыдэнцыя беларускага біскупа Станіслава Богуш-Сестранцэвіча ў Магілёве была сціслай настолькі, што ледзве ўмясціла ўласную канцылярыю біскупа і кансісторыю [16, s. 42].

У выніку рэарганізацый, у 1804 г. штаты шасці рымска-каталіцкіх і трох уніяцкіх кансісторый уключылі: афіцыяла, віцэ-вікарыя (віцэ-афіцыяла), трох асэсараў, двух сакратароў, пратакаліста і перакладчыка. У канцылярыях кожнай з кансісторый прадугледжваліся таксама пасады рэгістратара і кан-

цылярскіх служачых, адпаведна напружанасці працы, але не звыш шасці. Таксама прадугледжвалася два вартаўнікі з адстаўных ваеннаслужачых [8, т. 28, арт. 21467].

Акрамя дзяржаўнага замацавання структуры кіраўніцтва рымска-каталіцкай царквой яна ўзгаднялася з Папам Рымскім, што ажыццявілася праз грамату нунцыя І. А. Аркеці. Адпаведна, кансісторыя зацвярджалася ў складзе каад'ютара (біскупа-суфрагана) і канонікаў капітула з ліку Асуньскага, Люцынскага, Магілёўскага і Невельскага пробашчаў. Пры гэтым пасады ў капітуле і кансісторыі яны першапачаткова павінны былі сумяшчаць, і маглі быць пазбаўлены пасады за адмову выконваць абавязкі ў адным з органаў [17, с. 32; 8, т. 21, арт. 15876]. Аналагічныя патрабаванні па кадравым складзе прысутнасці прадпісваліся і ў дачыненні іншых рымска-каталіцкіх кансісторый пры іх утварэнні ў 1798 г., у тым ліку ў Мінскай дыяцэзіі [17, с. 114; 8, т. 21, арт. 18504]. Як правіла, у Магілёўскай кансісторыі было тры асэсары ў мэтах прыняцця рашэнняў большасцю галасоў. Сярод першых у 1785 г. ўзначаліў кансісторыю Ян Беніслаўскі, асэсарамі былі Цыпрыян Адынец, Адам Вышамірскі, Андрэй Берэнт, Юзаф Бышкоўскі, Юзаф Шышко. Адначасова сакратаром кансісторыі працаваў Сяргей Храчынскі, а сакратаром арцыбіскупа Вінцэнт Клімовіч [18, s. 124]. У 1788 г. асэсарамі Магілёўскай кансісторыі з'яўляліся А. Берэнт, Ю. Бышкоўскі і Ігнацій Багамолец, а пазней – Мацвей Маздзенеўскі, Антоні Маеўскі, Антоні Сыхра [19, арк. 32; 20, арк. 5].

Паводле рэгламенту 1789 г. намеснікам кансісторыі (афіцыялам) замест каад'ютара прызначаўся афіцыял з ліку магілёўскага, кіеўскага і полацкага біскупаў-суфраганаў [21, арк. 2]. Са стварэннем Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі ў 1801 г. адбываецца па яе аналогіі ўпарадкаванне кансісторыі пад кіраўніцтвам згаданага А. Берэнта, прызначанага афіцыялам [4, с. 30–31; 18, k. 118] у якасці асэсараў зменяць С. Шантыр, Л. Васілеўскі, Ю. Галынскі, а сакратаром стаў А. Маеўскі [16, s. 176–177, 194–195].

Канцылярыю кансісторыі першапачаткова фарміраваў біскуп, з 1801 г. яе служачыя зацвярджаліся Рымска-каталіцкай духоўнай калегіяй і вышэйстаячымі органамі дзяржаўнай улады. У канцы XVIII – пачатку XIX ст. канцылярыя складалася з сакратара або двух, пратакаліста, рэгістратара і перакладчыка, дапаможных служачых (канцылярыстаў) згодна з аб'ёмам дакументапатокаў [8, т. 28, арт. 21467]. Да 1803 г. таксама быў інстыгатар (фіскал), які па сваіх абавязках у Рэчы Паспалітай павінен быў выклікаць да суду па даносах грамадства за парушэнні духоўнага ладу незалежна ад сапраўднасці пазначаных у іх звестак і безадказна для сябе, ліквідавалася, таму што ўсе звароты павінны былі падавацца на агульных падставах [8, т. 28, арт. 21467]. Абавязкі паміж пратакалістам і рэгістратарам размяркоўваліся адпаведна пасад. Паралельна з 1788 г. дзейнічала таксама епархіяльнае ўпраўленне, якое ўвайшло ў другой трэці XIX ст. у склад кансісторыі

ў якасці першага стала [22, арк. 1]. Пры гэтым у штатах кансісторыі адсутнічала пасада архіварыуса [23, арк. 32].

У 1772 г. на беларускіх землях функцыянавалі мітрапалітальная Кіеўска-Віленская, Уладзіміра-Брэсцкая, Полацкая і Пінская уніяцкія епархіі [24, с. 6]. Акрамя таго, Ю. Лепкоўскі без наяўнасці епархіі займаў пасаду смаленскага ўніяцкага арцыбіскупа і архімандрыта ануфрыеўскага манастыра, якім валодаў [21, с. 197, 201; 25, s. 31, 54]. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у склад Расійскай імперыі ўвайшла Полацкая епархія на чале з Ясонам Смагаржэўскім, якая ахапіла ў 1772 г. уніяцкае духавенства, у тым ліку на тэрыторыі скасаванай Смаленскай епархіі, а з 1773 г. Гомельскага і Рагачоўскага дэканатаў Кіеўска-Віленскай епархіі. Аднак, Я. Смагаржэўскі выехаў за межы імперыі, а пасаду полацкага, віцебскага і мсціслаўскага арцыбіскупа заняў Іраклій Лісоўскі, які сфарміраваў кансісторыю з месцам знаходжання ў Ануфрыеўскім манастыры. Яе афіцыялам стаў Іаан Ястржэмбец-Красоўскі, а віцэ-афіцыялам Рыгор Кахановіч. У 1779 г. быў вызначаны склад кансісторыі з 3–4 расійскіх падданых. У 1785 г. І. Красоўскі замяшчаў арцыбіскупа падчас яго падарожжа ў Іерусалім, а пасля вяртання апошні перамясціў рэзідэнцыю недалёка – у в. Студзенец Мсціслаўскага пав. [6, с. 24–30, 34; 8, т. 19, арт. 13922; т. 20, арт. 15028].

Пашырэнне межаў Полацкай уніяцкай архіепархіі і ўваходжанне ў склад Расійскай імперыі Віленскай уніяцкай мітрапалітальнай епархіі звязана з другім і трэцім падзеламі Рэчы Паспалітай. У апошняй сярод асэсараў згадваюцца Ян Дылеўскі і Тамаш Вашчыловіч, а пісарам з'яўляўся Ян Макрыцкі [26, с. 174, 238, 356]. Пасля ліквідацыі ўсіх уніяцкіх епархій у 19 кастрычніка 1795 г., Кацярына II аднавіла іх структуру ўказам ад 28 красавіка 1798 г. Акрамя пазначаных вышэй ўзнавілі дзейнасць яшчэ дзве епархіі: Брэсцкая на чале з епіскапам А. Гланеўскім і Луцкая, якую ўзначаліў С. Левінскі. Дзейнасць мітрапалітальнай Літоўскай епархіі з цэнтрам у Вільні была адноўлена ў 1809 г. [8, т. 25, арт. 18503; т. 30, арт. 23482; т. 31, арт. 24118]. Месцам знаходжання Брэсцкай уніяцкай кансісторыі было м. Жыровічы. Структура ўніяцкіх кансісторый і штаты вызначаліся па аналогіі з рымска-каталіцкімі, як і падыходы да іх фарміравання. Пасаду афіцыяла (старшыні) кансісторыі на восьмым годзе службы заняў Антон Андрэевіч Тупальскі, які прыйшоў у яе асэсарам у 1799 г., у 1804 г. стаў віцэ-афіцыялам [26, с. 514]. Адзіным супрацоўнікам канцылярыі, які стаў сурагатарам і віцэ-афіцыялам (віцэ-прэзідэнтам) кансісторыі, вядомы Антон Сымонавіч Малевіч, які прыйшоў на пасаду пратакаліста ў 1798 г. [26, с. 357]. У пачатку XIX ст. пасады асэсараў займалі Васіль Варсаба, Ян Захаравіч Камар, Карніловіч Казімір [26, с. 167, 279, 290]. Пры гэтым Адрыян Бародзіч займаў азначаную пасаду з 6 па 22 лютага 1800 г. [26, с. 134].

Дзейнасць мітрапалітальнай Літоўскай епархіі з цэнтрам у Вільні была адноўлена ў 1809 г. [8, т. 31, арт. 24118]. Яна ўтрымлівалася за кошт даходаў ад фальваркаў Вака, Шэйхоле, Навагрудак, Рута і Быкевічы, а афіцыялам

у кансісторыі, якая змясцілася ў былым базыльянскім кляштары, стаў Ілля Макржыцкі, віцэ-афіцыялам – Іосіф Шыдлоўскі, а асэсарамі – Кліменцій Карсецкі, Андрэй Багенскі, Міхаіл Кульвец. У складзе канцылярыі адзначаны сакратары арцыбіскупа Францішак Захарэўскі і кансісторыі Феліцыян Тамаковіч, пратакалістам быў Антоній Рыдзеўскі, а рэгістратарам – Якаў Пешко [27, арк. 22–23].

У пратэстанцкіх цэрквах прадугледжвалася заснаваць кансісторыі ў 1782 г. У іх складзе пры адсутнасці значнай колькасці духавенства былі пастар і дзве свецкія асобы, якія штогадова абіраліся прыхаджанамі [8, т. 21, арт. 15356]. Аднак паводле кансістарыяльнай ўстановы 1783 г., якая была прынята на Біржанскім сінодзе, Віленская кансісторыя павінна была складацца з 9 членаў (3 – ад духавенства, 3 – з дваран, 3 – з грамадзян), але на практыцы ў ёй было 6 членаў з ліку дваран. Члены абіраліся кожныя два гады на Сінодзе [28, т. 5, арт. 3741]. Канфесіянальнымі справамі рэфарматараў займаўся Літоўскі евангелічна-рэфарматарскі сінод [28, т. 15, арт. 13854].

Такім чынам, кансісторыі ў епархіяльных адзінках хрысціянскіх канфесій на беларускіх землях пачалі ўтварацца ў 1770–1780-я гг. у адпаведнасці з патрабаваннямі для арганізацыі органаў дзяржаўнага кіраўніцтва Расійскай імперыі, а перыяд іх арганізацыйнага станаўлення расцягнуўся да пачатку XIX ст., што звязана з паступовасцю падзелаў Рэчы Паспалітай, а таксама спецыфікай канфесіянальнага кіраўніцтва, і дазволіла выкарыстоўваць вопыт папярэдкаў для павышэння аператыўнасці і эфектыўнасці арганізацыйных заходаў. Адпаведна, можна вылучыць два этапы кансістарыяльнага станаўлення на падставе зменаў у сістэме кіраўніцтва (за выключэннем пратэстанцкіх цэркваў), што адбылося на мяжы XVIII і XIX стст.

Кансісторыі з’яўляліся калегіяльнымі органамі, у якіх вырашальная роля належала главе епархіі (дыяцэзіі), а прысутнасць ажыццяўляла следства і рыхтавала праекты рашэнняў. Пры гэтым яе склад аднаўляўся кожныя тры гады, а ў праваслаўнай і ўніяцкай цэрквах павінен быў уключаць манаскае і прыходскае духавенства, а ў рымска-каталіцкіх кансісторыях яны сумяшчалі пасады з працай у капітуле. Члены прысутнасці, якіх у праваслаўных кансісторыях было ад 4 да 9, а рымска-каталіцкіх і ўніяцкіх па 3–4 пад кіраўніцтвам афіцыяла і віцэ-афіцыяла, у Віленскай лютэранскай кансісторыі 3–9 у разгледжаны час, акрамя выканання непасрэдных абавязкаў таксама курыравалі працу размеркаваных паміж імі структурных падраздзяленняў і службовых асоб канцылярыі. Пры гэтым у канцылярыях кансісторый не прадугледжвалася пасада актуарыуса, а яго абавязкі выконваў рэгістратар, замест натарыуса ўводзілася пасада пратакаліста, капіістамі ў рымска-каталіцкіх кансісторый былі памочнікі канцылярыстаў і быў перакладчык, а пасада інстыгатара (фіскала) існавала да 1803 г. Архіварыусы былі ўведзены ў якасці асобнай пасады ў праваслаўных кансісторыях, аднак яны сустракаліся з праблемай запаўнення вакансіі, таму гэтыя абавязкі

даручаліся аднаму з канцылярыстаў па напружанасці яго працы. Кіраўнікі епархій таксама карысталіся магчымасцю ўтрымання асобнай канцылярыі, якая пераважна абмяжоўвалася пасадай сакратара.

Нягледзячы на наяўнасць зацверджаных на агульнадзяржаўным узроўні штатаў канцылярый, іх структура рэгламентавалася на ўзроўні Сінода ў праваслаўнай царкве і кіраўнікоў епархіяльных адзінак у інаслаўных цэрквах. Адпаведна канцылярыя мінскай праваслаўнай кансісторыі ўключала пратакаліста і два павыцці, выдзеленыя па геаграфічнай прыкмеце, аднак у канцы XVIII – пачатку XIX ст. пры захаванні павыццяў было ўтворана два стала – прыказны і пратакольны. У рымска-каталіцкіх і уніяцкіх кансісторыях выкарыстоўвалася функцыянальная прыкмета размеркавання абавязкаў паміж пратакалістам і рэгістратарам, аднак у магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі асобна былі вылучаны справы епархіяльнага кіраўніцтва.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Барсов, Т. В.* Синодальные учреждения прежнего времени / Т. В. Барсов. – СПб.: литография Ив. О. Пухира, 1897. – 249 с.

2. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 1329. Оп. 1. Д. 19. Лл. 692–712об.

3. РГИА. – Ф.1329. Оп.1. Д. 252. Лл. 74–86.

4. *Антановіч, З. В.* Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782–1918 гг.) / З. В. Антановіч. – Мінск: Экоперспектива, 2016. – 226 с.

5. *Горючко, П. С.* Из истории органов управления Могилевской епархией конца XVIII-го и начала XIX-го столетия / П. С. Горючко. — Могилев губ.: Скоропечатня и литография Ш. Фридланда [1903?] // Могилевские епархиальные ведомости. – 1903. – № 3. – 32 с.

6. *Лужинский, В.* Записки Василия Лужинского, архиепископа Полоцкого / В. Лужинский. – Казань: типография Императорского университета, 1885. – 312 с.

7. *Олевская, В. В.* К вопросу о становлении московского епархиального управления в начальный синодальный период // Вестник ПСТГУ. Сер. II: История. История Русской Православной Церкви. – 2009. – Вып. II (32). – С. 7–17.

8. Полное собрание законов Российской империи. Собрание первое: в 45 т. – СПб.: Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1649–1825.

9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГА Беларусі). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 223.

10. НГА Беларусі. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 20.

11. НГА Беларусі. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 902.

12. НГА Беларусі. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 173.

13. НГА Беларусі. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 186.

14. НГА Беларусі. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 1086.

15. НГА Беларусі. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 547.

16. *Szantyr, S.* Zbiór wiadomości o kościele i religii katolickiej w Cesarstwie Rossyjskim, a szczególniej w prowincjach od Polski przyłączonych od czasu pierwszego rozbioru Polski aż do końca panowania Alexandra I i początków panowania Mikołaja I. Zebrany z pism urzędowych, dokumentów i własnego widzenia jednego urzędnika rządowego – rossyjskiego / S. Szantyr. – Poznań: Wydawnictwo i druk. W. Stefańskiego, 1843. – Cz. 1–2. – 405 s.

17. Акты и грамоты об устройстве и управлении Римско-католической церкови в империи Российской и царстве Польском. – СПб.: Типография второго отделения Е. И. В. канцелярии, 1849. – 240 с.

18. Directorium divini officii et missarum pro ecclestis Romano Catholicis archi-diecaesis Mohiloviensi per universum Imperium totius Russiae juxta computum veteris in annum post bissextilem primum a navitate vero domini MCCLXXXV. – Mohileviae: Typogr. IllmiE ac R. D. Archi-Epis. Mohil., 1785. – 124 s.
19. НГА Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 352.
20. НГА Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 1.
21. НГА Беларусі. – Ф. 3219. Воп. 1. Спр. 778.
22. НГА Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 2.
23. НГА Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 2. Спр. 2220.
24. *Марозава, С. В.* «Сваёй веры ламаць не будзем…» : супраціў дэўнізацыі ў Беларусі (1780–1839 гг.) / С. В. Марозава. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2014. – 217 с.
25. *Wereda, D.* Biskupi unickiej metropolii kijowskiej w XVIII wieku / D. Wereda. — Siedlce-Lublin: Wydawnictwo Werset, 2013. – 375 S.
26. *Лісейчыкаў, Д. В.* Святар у беларускім соцыуме. Прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. / Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск: Беларусь, 2015. – 719 с.
27. НГА Беларусі. – Ф. 3245. Воп. 5. Спр. 10.
28. Полное собрание законов Российской империи. Собрание второе: в 55 т. – СПб.: Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1830–1884.

**(Дата падачы: 27.02.2023 г.)**

*У. Я. Аўсейчык*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай, Наваполацк

*U. Auseichyk*
Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk, Novopolotsk

**УДК 392:273.2(476.5)**

## СТАРАВЕРСКІЯ АБШЧЫНЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 1960-Я – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 1980-Х ГГ.

## OLD BELIEVER COMMUNITIES OF THE VITEBSK REGION IN THE 1960S AND THE FIRST HALF OF THE 1980S

*У артыкуле прадстаўлена характарыстыка старажверскіх абшчын на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў 1960 – першай палове 1980-х гг. На аснове архіўных крыніц разгледжаны іх стан у згаданы перыяд, прааналізаваны колькасныя змены, ахарактарызаваны некаторыя дэмаграфічныя паказчыкі, выяўлены асаблівасці тэрытарыяльнага размяшчэння абшчын у паўночнай Беларусі ў 1960 – першай палове 1980-х гг. Асаблівая ўвага звернута на ўзаемаадносіны стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў з органамі савецкай улады.*

*Ключавыя словы: старавееры; рэлігійная абшчына; этна-канфесійная група; канфесія; паўночная Беларусь; Віцебская вобласць; БССР.*

*The article reviews the Old Believers' communities on the territory of Vitebsk region in 1960s and first half of the 1980s, analyzes their situation in this period on the basis of archival sources, analyzes quantitative changes, characterizes some demographic indices, reveals the*